Мода

# СТЫЛЬНЫЯ МУЖЧЫНСКІЯ АБНОЎКІ

## Класіка, сафары і рэтрадэталі спартыўнага стылю



**Састарэлае меркаванне, што моднымі тэндэнцыямі павінны цікавіцца выключна жанчыны, на шчасце, даўно засталося ў мінулым. Моцнай палове таксама ўласціва імкненне выглядаць прывабна, і імкненне гэта ані на кроплю не змяншае (хай даруе мне чытач таўталогію) мужнасць нашых мужчын. Пагаворым аб тым, што тэарэтычна прапануюць дызайнеры моцнай палове чалавецтва да гэтага летняга сезона і што практычна могуць знайсці ў крамах нашай краіны мужчыны, якія жадаюць быць на грэбні моднай хвалі.**

Мода жыве будучыняй, і летнія калекцыі-2023 дызайнеры прадставілі свету яшчэ зімой. Немагчыма не звярнуць увагу, што ў мужчынскіх лініях адзення вядучыя модныя дамы ў гэтым сезоне актыўна прапануюць смелыя дызайнерскія рашэнні. Моцную палову чалавецтва запрашаюць дадаць у гардэроб шмат яркіх і жыццярадасных прынтаў і колераў, якія да нядаўняга часу лічыліся выключна жаночай прэрагатывай. Імкнучыся аб'яднаць рамантычны вектар з брутальнай маскуліннасцю, мастакі ад моды прадставілі на подыумах курткі-бомберы з атласу, пяшчотных або яркіх колераў і нават з кветкавымі прынтамі. Яшчэ адзін трэнд мужчынскай моды, які стаў адкрыццём гэтага лета, — так званыя інфантыльныя матывы. Напрыклад, на паказе Louis Vuitton «дарослым хлопчыкам» было прапанавана ўспомніць дзяцінства і дадаць у свае вобразы дэталі, якія адсылаюць да дзіцячага адзення: аплікацыі, вышыўкі і малюнкі, хвалістыя краі кашуль і ўсё такое іншае. Міксаваць «інфантыльныя» дэталі рэкамендуецца з атрыбутамі дзелавога гардэроба або грубымі брутальнымі тэкстурамі. Зрэшты, падобныя вынаходствы — трэнд на інфантыльнасць і мужчынскае адзенне з «жаночымі» прынтамі — наўрад ці атрымаецца адшукаць у беларускіх гандлёвых цэнтрах, ды і наўрад ці на іх у нас будзе попыт. Пагаворым пра больш практычныя і прыстасаваныя да жыцця трэнды.

### Сур'ёзны чалавек

І да такіх трэндаў належыць, вядома, у першую чаргу моднае прачытанне мужчынскага касцюма. Як мы памятаем, прыгожай палове вясной і летам дызайнеры прапануюць апранацца ў «мужчынскія» касцюмы са штанамі, прычым асабліва актуальныя — касцюмы яркіх расфарбовак. Досыць яркія (хоць і больш прыглушаныя, чым у жаночай модзе) адценні касцюмаў — трэнд і ў модзе мужчынскай. Актуальны ў гэтым цёплым сезоне крой — двухбортныя пінжакі і шырокія штаны. На піку папулярнасці таксама касцюмы ў клетку або палоску. У трэндзе «гарадская класіка» — спалучэнне клятчатага пінжака і лёгкіх аднатонных штаноў або джынсаў. Варта адзначыць тэндэнцыю апошніх гадоў: мужчынскі дзелавы касцюм становіцца ўсё менш фармальным. А ў цэлым мода — гэта свята, метамарфоза, шоу, і мужчынская мода — не выключэнне. На сусветных подыумах у мужчынскіх калекцыях ужо не першы год раз-пораз дарагія тканіны «маскіруюцца» пад больш дэмакратычныя (напрыклад, ваўняныя — імітуюць фактуру дэніму, дадаюцца лён і шоўк, каб надаць тэкстылю «кэжуальную» структуру). Пры гэтым больш танны сегмент тэкстылю імкнецца выглядаць больш рэспектабельна. Вяртаючыся да колераў мужчынскага касцюма, адзначым, што гэтым летам вельмі актуальная карычневая гама. Гэта і колеры пустыні, і бэж, і тоны, якія выклікаюць асацыяцыі з афарбоўкай экзатычных парод драўніны: сандала, чырвонага дрэва. Карычневая палітра цалкам не выцясняе, зразумела, традыцыйныя для мужчынскага адзення чорны (на больш прахалодны час) і шэры (на гарачыя дні) з базавых калекцый, але складае ім альтэрнатыву. Гэтак жа, як і адценні сіняга колеру — ад шэра-блакітных да цёмных нэві і індыга.

### Шукальнік прыгод

Мода цыклічная, рухаецца па спіралі, і ў апошнія дзесяць гадоў дызайнеры нібы дамовіліся даказваць гэтую ісціну зноў і зноў. Не раз яны зазіралі ў 20-я, 30-я, 40-я, 50-я і, вядома, 90-я гады мінулага стагоддзя, а таксама ў 2000-я, вывуджваючы адтуль модныя цытаты, чэрпаючы там ідэі і натхненне. У сёлетнім цёплым сезоне мода — мужчынская і жаночая — вяртае нас у 1970-я. Гаворка — пра стыль сафары, які палюбіўся і знакамітым дызайнерам, і брэндам масмаркета. Любімае адзенне модніка гэтай вясной і летам — з накладнымі кішэнямі, ды і ў цэлым эстэтыка сафары: карычневая гама (пра якую мы ўжо казалі), свабодны крой штаноў, кашулі навыпуск і нават капелюшы а-ля Індыяна Джонс. Вядома, хадзіць па горадзе, як быццам сабраўся на паляванне ў савану, адважыцца не кожны (і дзякуй богу!). Але разумна камбінуючы рэчы ў стылі сафары з рэчамі іншых кірункаў (напрыклад, з джынсамі і класічнымі кашулямі), можна атрымаць цікавы і прывабны вобраз.



Пра цыклічнасць моды — яшчэ адзін безумоўны трэнд гэтага лета: «тотал дэнім». Ён адсылае нас у нулявыя. Пасля «нулявых» апранацца «ў джынсу» з галавы да ног доўга лічылася маркерам дрэннага густу. І вось, калі ласка, — цяпер можна і нават заахвочваецца стылістамі! Колер дэніму ў вобразе можа быць адзін, а можа быць такіх колераў і некалькі — не забараняецца. Насіць джынсавыя рэчы рэкамендуецца як з чэлсі або лоферамі, так і з кедамі і сандалямі. У спякоту ў трэндзе будуць доўгія джынсавыя шорты, а на прахалодныя дні актуальныя рэчы са скуры — як эка-, так і натуральнай. У першую чаргу гэта, вядома, курткі: іх прапануецца насіць з футболкамі, упрыгожанымі прынтамі. Актуальныя мужчынскія футболкі — з больш глыбокімі, чым звычайна прынята, выразамі: глыбіня выразу вар'іруецца ў залежнасці ад мускулістасці торса.

### Без права на памылку

Спартыўны стыль захоўвае папулярнасць у паўсядзённай мужчынскай модзе ўжо не першы сезон. Летам-2023 гэта рэчы з капюшонам, спартыўныя касцюмы ў стылі рэтра (на піку папулярнасці «алімпійкі», лампасы і іншыя «састарэлыя» спартыўныя дэталі). Трэнд досыць складаны: патрэбна мера і пэўны мастацкі густ, каб не выглядаць «прадстаўніком гапаты». Тым больш што спалучаць спартыўную вопратку дызайнеры прапануюць з рэчамі з класічнага і дзелавога стылю: словам, не ўпэўнены — не апранай.

Яшчэ адзін трэнд мужчынскай моды на прахалодныя вечары — утульныя світэры. Маецца на ўвазе не стрыманы і бяспройгрышны чорны базавы трыкатаж, а яркія мадэлі шчыльнай вязкі, з прынтамі ў выглядзе клеткі, палосак або ў стылістыцы колар-блок. Падыдзе трэнд не кожнаму: ёсць небяспека, што ваш трэндавы світэр будзе выглядаць не як моднае выказванне, а ў стылістыцы «бабулін любімы ўнучак». Так што і тут патрэбныя добры густ і ўменне аб'ектыўна ацаніць свой знешні выгляд у люстэрку.

### Ад тэорыі да практыкі

Што будзе модна гэтым летам і што рэальна будуць насіць у мужчынскім сегменце — на самай справе «дзве вялікія розніцы», кажуць дызайнеры. Запыты пакупнікоў мужчынскага адзення ў нашай краіне традыцыйна кансерватыўныя, а айчынныя вытворцы, зноў жа па традыцыі, удзяляюць модзе моцнай палове менш увагі.

Беларускія прадпрыемствы лёгкай прамысловасці сапраўды могуць задаволіць самы патрабавальны попыт. Але гэта датычыцца ў першую чаргу жаночай моды. Даводзіцца канстатаваць: з мужчынскай модай у нас усё больш сціпла — вытворцы арыентаваныя на жанчын, адзначае намеснік старшыні канцэрна «Беллегпрам» Наталля Мурашка. Да цёплага сезона беларускія кампаніі прапануюць мужчынам для працоўных будняў дзелавыя касцюмы і класічныя кашулі, для гарачых дзён — калекцыі з лёну. Экалагічнасць — адна з «адвечных каштоўнасцяў» моды трэцяга тысячагоддзя, і льняное адзенне для мужчын гэтак жа актуальна, як і для жанчын. Дарэчы, менавіта льняныя калекцыі беларускія дызайнеры па традыцыі любяць і ўмеюць ствараць з гэтага матэрыялу актуальныя модныя рэчы — і капсульныя калекцыі, і асартымент для масмаркета. Тэхналогіі дазваляюць вырабляць сучасныя льняныя тканіны не толькі ў колерах экапалітры, але і ў самых розных адценнях, з актуальнымі прынтамі. Ну, а тых, хто больш дэталёва адсочвае трэнды мужчынскай моды, выручаюць дызайнерскія прасторы, дзе можна набыць нешта адмысловае, адзначыла прадстаўніца «Беллегпрама». Такім чынам, casual пабеларуску — гэта ў першую чаргу лён, што, у прынцыпе, у спякоту зручна і практычна. Няма пытанняў і з «правільным мужчынскім касцюмам». З вытворцаў гэта, напрыклад, праверaны дзесяцігоддзямі «Камінтэрн» — касцюмы ад гэтага брэнда любяць беларускія чыноўнікі і кіраўнікі самых розных узроўняў. Прычым у брэнда ёсць мужчынскія касцюмы як больш дэмакратычнай цэнавай катэгорыі, так і прэміум-класа (пад маркай Valerosso). Мужчынскі дзелавы стыль — прастора для творчага пошуку і адносна маладога беларускага брэнда Lemongrass (тут, як распавялі ў дызайн-цэнтры кампаніі «Камволь», мужчынскія касцюмы шыюць па італьянскіх тэхналогіях і лекалах — а менавіта італьянскія дызайнеры лічацца ў свеце прызнанымі майстрамі мужчынскага касцюма). Брэнд «Камінтэрн» выпускае мужчынскія калекцыі, якія «робяць мужчын паспяховымі», Lemongrass адзначае вывераныя лініі і вытанчанасць сілуэтных формаў сваіх вырабаў. Мяркуючы па водгуках пакупнікоў, і тое, і другое — праўда.

Ёсць у Lemongrass і калекцыі casual, але ў асноўным у гэтым стылі распрацоўваецца адзенне для жанчын. Аднак, калі дадаць Mark Formelle, Elema (у тым ліку новы «элемаўскі» брэнд мужчынскага адзення «Etelier», натхнёны еўрапейскай класікай), «Калінку», «Світанак» і, вядома, калекцыі беларускіх дызайнераў — не танныя, але, безумоўна, вартыя ўвагі (шукаць іх трэба ў шоурумах і дызайнерскіх прасторах: We are, Trend park і г. д.), нейкі выбар з'яўляецца і ў тых мужчын, хто аддае перавагу не дзелавому, а больш нефармальнаму стылю. Тым больш што якасць — безумоўны і прызнаны плюс айчыннага адзення, а менавіта мужчыны схільныя ставіць якасць і зручнасць рэчаў вышэй за іх адпаведнасць «самым апошнім трэндам».

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**
**Фота аўтара і са свабодных інтэрнэт-крыніц.**

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Пачніце ўпарта караскацца на чарговую кар'ерную вяршыню, адкуль вам ветліва ўсміхаецца спадарыня Фартуна. Аднак не забывайце пра адпачынак — назапасіце сілы і сканцэнтруецеся на будучых здзяйсненнях. У канцы тыдня ваша працаздольнасць будзе відавочна павышанай. Зможаце паспець практычна ўсё, што запланавалі, і нават крыху больш. А ўвечары — выдатна адпачыць у коле сяброў.

**ЦЯЛЕЦ.** У панядзелак будзьце асцярожныя, сачыце за сваімі словамі, інакш можа ўзнікнуць канфліктная сітуацыя з начальствам. У сераду пажадана не рабіць ніякіх рашучых дзеянняў і не выступаць з праграмнымі заявамі. У суботу многія сітуацыі могуць для вас вырашыцца самым нечаканым чынам. Удзяліце больш увагі блізкім, ім неабходна ваша падтрымка і дапамога, але не дазваляйце згружаць усе іх праблемы на вас.

**БЛІЗНЯТЫ.** Цяпер не мае сэнсу супраціўляцца абставінам і спрабаваць штосьці змяніць. Надышоў момант, калі лепш плыць па цячэнні — так вы сэканоміце сілы і час. І ўсё хутка само сабой складзецца на вашу карысць. Ваша запаветнае жаданне выканаецца амаль без намаганняў. Творчая праца будзе станоўча ўплываць на настрой, яшчэ і прынясе адчувальны прыбытак. Цяпер ваш час.

**РАК.** На гэтым тыдні рызыкуеце занадта позна ўспомніць адзін з жыццёвых урокаў, які мог бы вам дапамагчы. Сцеражыцеся неабдуманых учынкаў і рэзкіх слоў. Нядрэнна было б паназіраць за акружэннем, каб пасля мець правільнае ўяўленне пра людзей, з якімі трэба будзе мець зносіны. У выхадныя варта падумаць пра сэнс жыцця: вам можа адкрыцца новае значэнне звыклых рэчаў.

**ЛЕЎ.** Найбольш правільны падыход на гэтым тыдні — пабольш працаваць і паменш размаўляць. Гэта будзе цалкам адпавядаць вашаму настрою. Важна пазбягаць сумневаў і эмацыянальных зрываў. У пачатку тыдня магчыма кароткая паездка ці камандзіроўка. У чацвер пастарайцеся пазбегнуць сустрэч з начальствам, бо ваша нястрыманасць можа прывесці да канфлікту.

**ДЗЕВА.** У цэлым тыдзень можа аказацца занадта клапотным. У першую чаргу, займайцеся абавязковымі справамі, астатнія пакуль адкладзіце. Не крытыкуйце і не абмяркоўвайце дзеянні кіраўніцтва, вас могуць няправільна зразумець, што перашкодзіць кар'еры. У чацвер не ігнаруйце сяброўскіх парад. Галоўнае — нікога не пакрыўдзіць. Нядзеля — адзін з самых спрыяльных дзён тыдня, усе справы будуць удавацца.

**ШАЛІ.** Ваша добрасумленная праца мае ўсе шанцы быць адзначанай пахвалой ці павышэннем. У аўторак шмат цікавага і прыемнага абяцаюць знаёмствы з новымі людзьмі і іх арыгінальнымі ідэямі. Не адмаўляйцеся ад запрашэння сяброў весела правесці час. У выхадныя добра было б знайсці час для загараднай прагулкі.

**СКАРПІЁН.** На гэтым тыдні вы здольныя лёгка абяззброіць крытычна настроеных да вас людзей сваёй увагай і добразычлівасцю. Выніковасць дзеянняў, як абяцаюць зоркі, прыкметна ўзрасце, заробак павысіцца. Многае паспееце зрабіць. Адкіньце непатрэбныя сумневы і змяняйце сваё жыццё да лепшага. Пазбягайце незразумеласцяў на працы і ў асабістых адносінах.

**СТРАЛЕЦ.** Тыдзень падзеліцца на дзве практычна супрацьлеглыя паловы: яго пачатак добра падыдзе для завяршэння спраў, канец жа прынясе поспех у новых пачынаннях. Панядзелак можа аказацца адным з самых удалых дзён. У сераду не варта прызначаць дзелавыя сустрэчы, лепш папрацаваць у адзіноце. Выхадныя правядзіце на дачы.

**КАЗЯРОГ.** Тыдзень можа прынесці яснасць з далейшымі планамі ў вашай кар'еры. Магчыма, атрымаеце неабходную інфармацыю для прыняцця канчатковага рашэння. Цяпер не варта прыслухоўвацца да парад «добразычліўцаў», давярайце сваёй інтуіцыі. Вынік вашых намаганняў не прымусіць чакаць, і вы гэта адчуеце. У выхадныя знайдзіце час на шпацыр па лесе.

**ВАДАЛІЎ.** У пачатку тыдня паспрабуйце не выступаць з ідэямі і прапановамі. Калі вырашыце вылучыцца такім чынам, вас могуць няправільна зразумець. Няварта ствараць сабе лішніх праблем. Лепш проста спакойна рабіць сваю справу. Цяпер наогул не час штосьці мяняць. Хоць у выхадныя вам, падобна, давядзецца перагледзець некаторыя свае прынцыпы.

**РЫБЫ.** На гэтым тыдні варта пусціць у ход усю вашу дыпламатычнасць, каб пазбегнуць сур'ёзнай сваркі з начальствам або з членамі сям'і. Непажадана прападаць на працы днямі і начамі, імкніцеся працаваць размерана, не бярыцеся за выкананні звышзадач, гэтым можаце падарваць сваё здароўе. Вы цалкам здольныя знайсці неардынарнае рашэнне сваіх праблем.

Даты | Падзеі | Людзі

**27 МАЯ**

У краіне

**1898** год — нарадзіўся (Віцебская губерня) Барыс Аляксеевіч Пігарэвіч, генерал-палкоўнік. У войску з 1915-га, у Чырвонай Арміі — з 1918-га. Удзельнік савецка-фінляндскай (1939—1940) вайны. У Вялікую Айчынную з 1941-га на Заходнім, Калінінскім, Карэльскім франтах: начальнік штаба войскаў, франтоў, камандзір корпуса. Удзельнік баёў пад Смаленскам, Масквой, у Савецкім Запаляр'і. Пасля вайны выкладаў у Ваеннай акадэміі Генштаба, быў намеснікам начальніка Генштаба Войска Польскага, да 1959-га — на адказных пасадах у Савецкай Арміі.



**1923** год — нарадзіўся Абрам Аркадзьевіч Турэўскі, беларускі вучоны ў галіне гісталогіі і эмбрыялогіі, доктар біялагічных навук, прафесар. Аўтар навуковых прац па пытаннях гарманальнай рэгуляцыі гісталагічных і гістахімічных уласцівасцяў унутраных органаў у норме і ўмовах парушанай энтэрагепатычнай цыркуляцыі жоўці пры эксперыментальнай ахаліі і халестазе.

**1968** год — у Мінску быў створаны Цэнтральны дзяржаўны архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі Беларусі (з 1993-га — Беларускі дзяржаўны архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі), метадычны цэнтр па рабоце з праектнай, канструктарскай, навукова-даследчай, патэнтнай і іншай дакументацыяй, якая стваралася праектнымі, канструктарска-тэхналагічнымі, навукова-даследчымі арганізацыямі Рэспублікі Беларусь.

У свеце

**1703** год — у дзень Святой Тройцы ў вусці ракі Нява на Заячым востраве Пятром І была закладзена крэпасць. Менавіта гэты дзень лічыцца днём заснавання горада Санкт-Пецярбурга, які больш за 200 гадоў з'яўляўся сталіцай Расійскай імперыі. План будучай крэпасці накрэсліў сам Пётр. Сваё імя — Санкт-Піцербурх — крэпасць атрымала ў Пятроў дзень, калі тут была закладзена царква Святых апосталаў Пятра і Паўла. Праз некалькі гадоў крэпасць была названа Петрапаўлаўскай — па назве яе галоўнага сабора. У 1720-м назва Санкт-Піцербурх мяняецца на Санкт-Пецярбург. Акрамя афіцыйнай назвы, у народзе з'яўляецца таксама скарочанае, на рускі манер — «Піцер-град» ці проста «Піцер».

**1918** год — УЦВК і СНК прынялі Асноўны закон аб лясах.

**1948** год — нарадзіўся Аляксандр Аляксандравіч Волкаў, лётчык-касманаўт СССР, Герой Савецкага Саюза (1985). За тры палёты Аляксандр Волкаў правёў у космасе 391 суткі 11 гадзін 52 хвіліны, здзейсніў два выхады ў адкрыты космас сумарнай працягласцю 10 гадзін 12 хвілін. З 1991 да 1998 года ўзначальваў атрад касманаўтаў, застаючыся таксама інструктарам-касманаўтам-выпрабавальнікам.



Так гаварыў...

**МАКСІМ ГОРКІ:**
*«Няма людзей чыста беленькіх або цалкам чорненькіх; людзі ўсе пярэстыя».*

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 4.50 | 21.24 | 16.34 |
| Віцебск | 4.33 | 21.21 | 16.48 |
| Магілёў | 4.40 | 21.14 | 16.34 |
| Гомель | 4.45 | 21.02 | 16.17 |
| Гродна | 5.07 | 21.38 | 16.31 |
| Брэст | 5.16 | 21.30 | 16.14 |

### Месяц

*Першая квадра ў 18.22.*
*Месяц у сузор'і Дзевы.*

### Імяніны

**Пр.** *Максіма, Мікіты, Нікіфара, Сідара.*

**К.** *Магдалены, Аўгусціна, Юльяна, Яна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Сказала мужу, што хачу быць яго найлепшым сябрам. Пасля чаго ён адкрыў бляшанку піва і пачаў расказваць мне, як яму надакучыла сямейнае жыццё.**

— Доктар, малю, прыязджайце неадкладна. У жонкі моцны прыступ апендыцыту!

— Не хвалюйцеся. Два гады таму я зрабіў вашай жонцы аперацыю і выдаліў сляпы адростак. У чалавека не можа з'явіцца другі апендыкс!

— Правільна, доктар. Але ў чалавека за гэты час можа з'явіцца другая жонка.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 10.441. Індэкс 63850. Зак. № 1194.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 26 мая 2023 года.